**ВЫТОКІ І ВЫНІКІ АНТАГАНІСТЫЧНАСЦІ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГЕРОЯЎ У ДРАМЕ “КНЯЗЬ ВІТАЎТ” А. ДУДАРАВА**

***Амеліна А.А.,***
*студэнтка 1 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Падстаўленка В.Ф., канд. філал. навук, дацэнт

П'еса “Князь Вітаўт” (1993) стала прыкметнай з’явай у межах жанру сучаснай беларускай гістарычнай драмы.

Мэта артыкула: выявіць вытокі і вынікі антаганістычных пазіцый цэнтральных герояў у п’есе “Князь Вітаўт” Аляксея Дударава.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання з’яўляецца названы твор Дударава. Асноўнымі для навуковага аналізу былі абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага і дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** П’еса “Князь Вітаўт” Аляксея Дударава – гістарычная драма, якая адлюстроўвае значныя дзяржаўныя падзеі XIV ст. У гэтым творы выявіўся наватарскі падыход пісьменніка да ўвасаблення фактаў мінулага ў мастацкай прасторы. Перш за ўсё, п’еса ўнікальна тым, што напісана вершаванай мовай, у прыватнасці, класічным пяцістопным ямбам. Па-другое, у ёй рэпрэзентаваны як сапраўдныя гістарычныя асобы (князі Вітаўт і Ягайла), так і дзейнічаюць міфалагічныя істоты (паганскія багі, духі). Па-трэцяе, мастацкая прастора драмы звязана з рэальнымі геаграфічнымі мясцінамі (Гародня, Крэва, Трокі, Вільня, Кракаў). Тым самым ствараецца дадатковы эфект панарамнасці апісаных момантаў.

У падзейнай аснове п’есы ляжыць канфлікт паміж двума стрыечнымі братамі Вітаўтам і Ягайлам. Так, вобраз першага раскрываецца як прыклад даверлівага і залішне эмацыйнага чалавека. Другі гістарычны вобраз прадстаўлены найперш як дастаткова жорсткі, прагматычны палітык. Нягледзячы на вышэй акрэсленую ідэйную скіраванасць названых герояў, гэтыя вобразы зусім не адназначныя і дастаткова складаныя ў матывацыях і ўчынках.

Ягайла з’яўляецца самым складаным героем твора. Ён прэзентуецца дастаткова “гнуткім” і хітрым палітыкам, які зробіць усё магчымае для ўтрымання ўлады ў сваіх руках. На гэта ўказваецца, напрыклад, у наступных радках:

“Тут трэба хітраваць і быць вужакай,
Падумаўшы адно – сказаць другое,
А ўрэшце нешта трэцяе зрабіць [1, с. 152]”.

Як вядома, Ягайла заключыў пагадненне з Тэўтонскім ордэнам, ажаніўся з Ядвігай, прыняў каталіцкую веру. Але, будаваўшы нейкія грандыёзныя планы, ён зусім забыўся на кантроль за так званай унутранай палітыкай. Пачаліся хваляванні людзей у княстве, але Ягайла неахвотна прыслухоўваўся да дадзеных яму ў гэтай сітуацыі парад. Пазней князь здзяйсняе справядлівае пакаранне заўважаных у гвалце і забойствах, але гэта з’яўляецца хутчэй толькі яго стратэгічным ходам, каб стрымаць народную незадаволенасць сваёй палітыкай:

“І тут вярнуўся з Віцебска Ягайла,
У акружэнні белых крыжакоў.
І хуткі суд пачаўся. Майго сына
Павесілі за рэбры на крукі,
На востры кол унука пасадзілі,
Два дні малую ўнучку мардавала
На загуменні княжская гайня
За здраду бацькаву! Каму ж, каму ён здрадзіў?!
Хіба служыў не княству, не Літве,
Не роду Гедыміна? Адкажы,
Вялікі Вітаўт, простаму ліцвіну [1, с. 159]!”

Прыведзеныя словы рамесніка акрэсліваюць яшчэ адну рысу характару Ягайлы – ганарлівасць. Пасля пачутага суд пакараў гэтага воя, нягледзячы на яго вернасць сваёй краіне, бо ён пайшоў служыць не таму князю. Такім чынам уладар вырашыў паказаць сваю моц, пацвердзіць “жалезную” ўладу.

Вобраз Ягайлы падаецца як прыклад удалага маніпулятара. Ён умее зручна атрымаць добры для сябе вынік, нават не аддаючы патрэбнага загаду. Менавіта такая сітуацыя акрэсліваецца з Люценем, стражнікам Ягайлы:

“Ягайла:
Мы праверым зараз,
Ці кемлівы ты, Люцень. Адкажы:
Жыццё, хвароба, смерць. Вось тры сястрыцы,
І кожная з сваёй чары п’е.
Якая і з якой?
Люцень:

Репозиторий ВГУ

Падумаць трошкі трэба...
Здаецца мне, што медзь – гэта жыццё,
Хвароба ж болей ладзіцца са срэбрам,
А золата вышэйшае – то смерць [1, с. 149]".

У выніку, рукамі свайго стражніка Ягайла забіў Кудаша і Кейстута.

Вобраз Ягайлы не пазбаўлены і частковага высакародства, ён цэніць і яго праяўленне ад іншых. Тут трэба згадаць моманты ўваходжання ў Трокі спачатку Вітаўта, а пасля і Ягайлы. Абодва разумелі, што крок вельмі рызыкоўны, і яны маглі не вярнуцца назад.

У канцы твора Кароль Польскі паўстае перад чытачамі па-іншаму. Персанаж выклікае спачуванне. Ягайла прымае паражэнне ад свайго стрыечнага брата, але на гэта ёсць істотныя прычыны і ідэйная логіка твора. У канцэптуальным плане ўся п'еса пабудавана на супрацьстаянні дабра і зла, і, канешне, тут дабро атрымлівае перамогу.

Вобраз Вітаўт таксама прадстаўлены як узор добрага палітыка. Але, што важна, сваю рэпутацыю ён заваяваў не жорсткасцю, а дабрынёй і справядлівасцю. Гэты князь паказваецца залішне даверлівым чалавекам, што прыводзіць да няшчасцяў у яго лёсе. Для Вітаўта кроўныя сувязі вельмі важныя, таму да апошняга ён не можа паверыць у здрадніцтва брата.

Як адзначалася, вобразы князёў ў п'есе адлюстроўваюць барацьбу дабра і зла. Дадзеную выснову сцвярджае міфічны персанаж Купала:

"З любові гэты створаны Сусвет,
Любові ж творца – будаўнік Сусвету.
Калі нянавісць, ганарлівасць, зло
Не знойдуць месца ў сэрцы чалавека,
Сыдуцца разам цемра і святло,
Цяпло і холад. Заўтра і ўчора,
Жыццё і смерць. Пачатак і сканчэнне" [1, с. 143].

Адзначанымі словамі багіня Жыцця раскрывае сутнасць мастацкага канфлікту твора. Яна выступае трэцім складнікам цэнтральных перыпетый, персанажам-носьбітам незалежнай думкі, які вымушае чытача спыніцца і паразважаць над сэнсам адлюстраванага.

У многім дзякуючы і такім вобразным акцэнтам у драме "Князь Вітаўт" сцвярджаецца думка, што галоўнымі каштоўнасцямі на зямлі з'яўляюцца міласэрнасць, любоў, еднасць, згода і мір.

**Заключэнне.** Такім чынам, у прадстаўленай гістарычнай п'есе на прыкладзе драматычных лёсаў Вітаўта і Ягайлы раскрываецца сутнасць "вечнай" барацьбы дабра і зла, выяўляюцца яе прычыны і вынікі. На гэтым грунтуецца глыбокі маральна-філасофскі змест твора.

1. Дудараў, А. Князь Вітаўт: п'еса / А. Дудараў. – Мінск: Маст. літ., 2006. – 318 с.

## ЛИТЕРАТУРНЫЕ ТОПОНИМЫ В ТРИЛОГИИ РОМАНОВ-СКАЗОК Н.Н. НОСОВА О НЕЗНАЙКЕ

***Андручёнок А.С.,***
*студентка 3 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Глазман Л.Я., канд. филол. наук

Исследований, посвященных изучению ономастичекого пространства детской русской литературы, немного. Кроме того, рассматривая работы, очерчивающие проблемы литературной ономастики, можно обнаружить неравномерность в рамках выбора материала для изучения: бóльшая часть работ написана о литературных антропонимах, изучению других поэтонимов уделяется мало внимания. К тому же, учёные-ономасты отдают предпочтение изучению «взрослой» литературы. Итак, актуальность нашего исследования обусловлена малочисленностью ономастических исследований детской русской литературы, а также недостаточностью внимания к поэтическим топонимам.

Цель работы – изучить литературные топонимы романов-сказок Н.Н. Носова о Незнайке.

**Материал и методы.** Материалом для исследования стал текст романов-сказок Н. Носова о Незнайке. Методы исследования: анализ, сопоставление, обобщение тезисов специальной литературы, элементы культурно-исторического анализа.

**Результаты и их обсуждение.** В произведениях о Незнайке автор употребил 91 топоним. Каждая из частей трилогии построена на путешествии героев-коротышек. Вхождение в новое пространство сопровождается появлением новых онимов. Художественное пространство конкретизируется с помощью литературных топонимов, поэтому концентрация употребления новых слов, обозначающих название любых географических объектов, наблюдается в начале каждой отдельной части трилогии.

Первый топоним текста – *Цветочный город*. Это родной город Незнайки. Фонетическое и семантическое оформление данного топонима настраивает на восприятие чего-то положительного и приятного. В городе царит покой и благополучие. Улицы, бульвары и аллеи имеют соответствующие названия:

Репозиторий ВГУ